# Са славянскай спадчыны

Па ініцыятыве Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Томскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта і Нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Томскай вобласці адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Захаванне славянскай гісторыка-культурнай спадчыны: вопыт, праблемы і перспектывы».

Ідэя правядзення форуму ўзнікла падчас знаёмства з кіраўніком беларускай дыяспары Томскай вобласці Любоўю Адаскевіч, якая прыязджала летась у Мінск у складзе дэлегацыі на II Рэспубліканскі фестываль мастацтваў беларусаў свету. Ініцыятыву падтрымалі на кафедры сусветнай гісторыі Томскага дзяржаўнага педуніверсітэта дзякуючы дацэнту, кандыдату гістарычных навук Таццяне Ганчаровай. Мерапрыемства аб'яднала больш як 50 вядучых навукоўцаў, якія вывучаюць славянскія культуры ў гістарычным, культуралагічным, філалагічным і філасофскім аспектах.

Праца канферэнцыі паказала, што вывучэнне славянскіх культур — важны аспект. Тэматыка дакладаў атрымалася разнастайнай: ад феномена славянскай кнігі да грамадзянскіх ініцыятыў у захаванні традыцыйнай славянскай культуры.

Уразіла геаграфія ўдзельнікаў: Томск, Мінск, Новасібірск, Барнаул, Кемерава, Северск, Марыупаль, Вроцлаў, Ерэван...

На базе гісторыка-філалагічнага факультэта ТДПУ адкрыты Цэнтр руска-польскай мовы — прадстаўніцтва Вроцлаўскага ўніверсітэта. Студэнты, якія засвоілі праграму адпаведнай лінгвістычнай падрыхтоўкі, могуць стажыравацца або працягнуць навучанне ў Польшчы па магістарскай праграме двайных дыпломаў «Лінгвакультуралогія». Часта праводзяцца выязныя археалагічныя, фальклорныя і дыялекталагічныя практыкі ў розных рэгіёнах Расіі.

Дэканы факультэта культуры і мастацтваў і гісторыка-філалагічнага факультэта — Таццяна Галкіна і Кацярына Каюмава — паказалі свае ўнікальныя бібліятэчныя зборы, галерэі, музеі, майстэрні і адмысловыя выставачныя калекцыі (збіраюцца студэнтамі і педагогамі на працягу многіх гадоў падчас экспедыцый). Паміж факультэтам культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і гісторыка-філалагічным факультэтам Томскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта падпісаны меморандум аб супрацоўніцтве.

Удзельнікі канферэнцыі наведалі ў Томску гістарычныя мясціны і ўстановы культуры. Адна з самых адметных — Першы музей славянскай міфалогіі, які вядучыя спецыялісты ў сферы музеязнаўства называюць месцам павышэння кваліфікацыі экскурсаводаў. Нельга было абмінуць аб'екты драўлянага дойлідства, тэатр лялек Уладзіміра Захарава «Два плюс Ку».



*З прадстаўнікамі беларускай дыяспары.*

**Павел САПОЦЬКА,
выкладчык кафедры
міжкультурных камунікацый
БДУКМ**

РЕПОЗИТОРИЙ